Звязда

16.12.2019

# Стартаваў праект «Кнігі Беларусі. Год 2019»

---

Алена Драпко

**Учора ў выставачнай зале Нацыянальнай бібліятэкі стартаваў праект «Кнігі Беларусі. Год 2019». Яго арганізатарам выступіла Міністэрства інфармацыі сумесна з Нацыянальнай кніжнай палатай і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Гэты год для айчыннага кнігавыдання стаў вельмі плённым: больш за 520 суб'ектаў кнігавыдання, дзякуючы якім сёлета выдадзена звыш 9 тысяч кніг агульным тыражом больш за 20 мільёнаў экзэмпляраў. На выстаўцы прадстаўлены менавіта найлепшыя кнігі 2019 года.**

---



— Сённяшняя сустрэча — гэта даніна павагі нашым майстрам прыгожага пісьменства, літаратарам, кнігавыдаўцам і ўсім тым людзям, якія робяць значны ўнёсак у развіццё айчыннай літаратуры і культуры ў цэлым. Прэзідэнт нашай краіны падкрэслівае, што культура — гэта падмурак, на якім фарміруецца і развіваецца нацыя. І якраз такі кніжнае слова, слова пісьменніка займае ў гэтым няпростым працэсе адметнае месца. Таму вельмі важна, у тым ліку і на дзяржаўным узроўні, падтрымліваць кнігавыдавецкую справу,

спрыяць яе пашырэнню, ствараць належныя ўмовы для папулярызацыі кніжнага чытання, — адзначыў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй Кунцэвіч.** — І трэба сказаць, што беларускую кнігу паважаюць і ведаюць не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Пра гэта яскрава сведчаць вынікі міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» краін СНД, дзе сярод дзяржаў Садружнасці па колькасці ўзнагарод за 16 гадоў яго правядзення Беларусь займае першае месца. Гэта стала магчыма дзякуючы руплівай працы вялікай колькасці пісьменнікаў, кнігавыдаўцоў, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры.

Кніжны праект аб'яднаў і сабраў на ўнікальнай выстаўцы сотні дзяржаўных і прыватных выдаўцоў, індывідуальных прадпрымальнікаў. Тут кожны меў магчымасць азнаёміцца з кнігамі, што былі выдадзены ў Беларусі сёлета. Новы фармат кніжнай падзеі заклікаsuccessfully падкрэсліць значэнне кнігі, культуры чытання, ролю кнігавыдаўцоў, аўтараў у незалежнай беларускай дзяржаве.




У нашага выдавецкага дома на выстаўцы быў асобны стэнд.

— Сёння ў нашай бібліятэцы распачата яшчэ адна традыцыя ў кніжнай культуры Беларусі, — адзначыў **дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі.** — І мне хацелася б, каб у час дзеяння выстаўкі гэтае месца стала пляцоўкай для сустрэч аўтараў, кнігавыдаўцоў. Давайце сустракацца, каб наша кніга 2020 года была яшчэ лепшая.

— Мы пастаянна прырастаем новымі ідэямі, перамогамі ў галіне кнігавыдання. І тыя кнігі, якія прадстаўляюць нашу краіну за мяжой, — гэта годнае ўвасабленне пасылаў, што з'яўляюцца важнымі для дзяржавы ў рамках падтрымкі кнігі, кнігавыдаўцоў і аўтараў, — падкрэсліў **намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі**. — Сярод кніг, што прадстаўлены тут сёння, — зусім невялікі працэнт выданняў падведамасных нам дзяржаўных выдавецтваў, а астатнія — гэта прыватныя кнігавыдаўцы. Я спадзяюся, што тыя вынікі, якія мы маем сёння, будуць развівацца, бо пляцоўка для гэтага створана.

На адкрыцці выстаўкі сімвалічна назвалі найбольш папулярнага на сённяшні дзень аўтара і кнігу. Па выніках аналізу інфармацыі кнігагандлюючых арганізацый Нацыянальнай кніжнай палаты гэта «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча.




Арганізатары мерапрыемства і выдавецтвы Беларусі ў рамках навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» падрыхтавалі сюрпрыз гораду — сталіцы Дня беларускага пісьменства ў 2020 годзе — Бялынічам Магілёўскай вобласці, — сертыфікат на права атрымання друкаванай прадукцыі для Бялыніцкай школы-інтэрната. А ўсе прысутныя таксама атрымалі падарунак — паказ спектакля-мюзікла «Пясняр». Спектакль Нацыянальнага драматычнага тэатра імя М. Горкага прысвечаны народнаму артысту СССР Уладзіміру Мулявіну, дзякуючы якому беларуская песня і паэзія сталі часткай сусветнай культуры. Акрамя гэтага, яркім акцэнтам мерапрыемства сталі экспанаты музея У. Мулявіна, а таксама кніга пра музыканта, якая карыстаецца нязменнай папулярнасцю ў чытачоў на працягу апошніх гадоў як у Беларусі, так і за мяжой.

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ**

## Загаловак у газеце: Краіна кніг